УДК 796.06:316.4

***Уладзімер Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimier Lukievic***
*Candidate of Philosophical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines and Methods of their Teaching*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: lucul@brsu.by

# СУЧАСНЫ СПОРТ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМАЦЫІ САЦЫЯЛЬНАЙ СІСТЭМЫ

*Функцыянаванне сучаснага грамадства шмат у чым падпадае пад прыкметы крызісу. Спорт, як неад'емны атрыбут грамадскага развіцця, не можа застацца ўбаку ад шэрагу трывожных тэндэнцый. Таму ва ўмовах трансфармацыі сацыяльнай сістэмы ён набывае новую якасць. Аўтар прагназуе падзел спорту па двух наступных напрамках. Першы, калі зыходзіць з класічнага ўспрымання і прынцыпаў сумленнай і высакароднай гульні, можна пазначыць як Fair play games. Другі напрамак, які паўстае пад назвай Open games, характарызуецца як спаборніцтвы, дзе ігнаруюцца асноўныя правілы барацьбы, адсутнічае практыка допінг-тэстаў і г. д. Таксама аналізуецца пытанне аб правядзенні Enhanced Games. Ідэалагічнае абгрунтаванне гэтых гульняў падаецца як абнаўленне алімпійскай мадэлі ў XXI ст.*

***Ключавыя словы:*** *Алімпійскія гульні, глабалізацыя, допінг, камерцыялізацыя, новыя гульні, прафесіяналізацыя, спорт, трансфармацыя.*

## *Modern Sports in Conditions of Transformation Social System*

*The functioning of modern society largely falls under the definition of a crisis. Sport, as an integral attribute of social development, cannot remain aloof from a number of alarming trends. Therefore, in the conditions of transformation of the social system, it acquires a new quality. The author predicts the division of sports in the following two directions. The first, based on the classical perception and principles of fair and noble play, can be called Fair play games. The second direction, which stands out under the name Open Games, is characterized as competitions in which the basic rules of meets are ignored, there is no practice of conducting doping tests, etc. The article also analyzes the issue of holding Expanded Games. The ideological rationale for these games is presented as an updated version of the 21st century Olympic model.*

***Key words:*** *Olympic games, globalization, doping, commercialization, new games, professionalization, sports, transformation.*

### Уводзіны

Сучасны спорт у першай чвэрці XXI ст. у хуткім тэмпе пачаў мяняць сваё аблічча і ўнутраны змест. Такое становішча паўстала з нагоды шэрага разнастайных фактараў, якія патрабуюць больш дэталёвага асэнсавання. Перадумовай да напісання дадзенага матэрыялу паслужыла падзея, якая адбылася падчас правядзення чэмпіянату свету па лёгкай атлетыцы 2023 г. у Будапешце. Менавіта яна ўзбудзіла палеміку адносна сучаснага ўспрымання сутнасці спорту і адначасова стварыла падставы для філасофскай рэфлексіі ў накірунку да фарміравання новай парадыгмы яго функцыянавання і развіцця.

Сацыяльная структура грамадства кваліфікуе спорт у якасці сваёй неад'емнай часткі. Гэта выразна выяўляецца ў тым, што ўсе найважнейшыя тэндэнцыі, якія дамінуюць у розных сферах чалавечай дзейнасці, так ці інакш маюць дачыненне да галіны спорту. Праблемы крызіснага стану сучаснага спорту вымалёўваюцца праз сістэму яго рэалізацыі не толькі ў форме спаборніцтваў. Маецца шэраг іншых паказчыкаў, якія маюць дачыненне да гэтага працэсу. Дастаткова нагадаць пра допінгавае злоўжыванне, фінансавыя маніпуляцыі, махлярства і інш. Не менш разбуральна адносна самой сутнасці спорту выглядае сітуацыя, якая мае дачыненне да т. зв. загадзя ўсталяванага выніку спартыўнай падзеі, што самым непасрэдным чынам уплывае на канчатковае размеркаванне ўдзельнікаў змаганняў у турнірнай табліцы.

У сённяшніх рэаліях спорт функцыянуе ў межах глабальнага сацыяльна-гаспадарчага крызісу, які абумоўлены вытворчасцю і збытам тавараў, гандлёвымі адно-

сінамі, праблемамі канкурэнтаздольнасці, банкруцтва суб'ектаў эканамічнай дзейнасці, фінансавай нестабільнасці і інш. Да гэтага трэба далучыць недасканалае фінансава-эканамічнае кіраванне, прыродныя катаклізмы, войны, катастрофы. Да таго ж існуюць эканамічныя, сацыяльна-дэмаграфічныя, вайскова-палітычныя, псіхалагічныя, экалагічныя, пандэмічныя і іншыя варыянты крызісу. На найвышэйшым узроўні абвастрэння супярэчнасцей утвараецца сітуацыя, якая нясе пагрозу знішчэння сацыяльна-эканамічнай сістэмы. Класічная мадэль спорту дэградуе пад ціскам знешняга ўплыву.

Калі дэфінітыўна акрэсліць, што ж такое спорт, то разнастайныя даведнікі тлумачаць даволі няўцямна названае паняцце, як, напрыклад, 'фізічныя практыкаванні для развіцця і загартоўкі арганізма, ці занятак, які з'яўляецца прадметам азартнага захаплення' [1, с. 619]. З іншага выдання можна даведацца, што гэта фізічныя практыкаванні (гімнастыка, барацьба, турызм і інш.) з мэтай умацавання арганізма, дасягнення высокіх вынікаў у спаборніцтвах [2, с. 408]. Але, бадай, адной з найбольш пашыраных трактовак паняцця «спорт» з'яўляецца азначэнне ў «The World Book Dictionary»: 1) гульня, спаборніцтвы ці іншая забава, што патрабуе некаторага майстэрства і зграбнасці, а таксама пэўнай колькасці фізічных практыкаванняў; 2) усялякая забава або пацеха; 3) жартаўлівая гульня, забава; 4) высмейванне; 5) аб'ект жартаў ці высмейвання, пасмешышча; 6) што-небудзь, чым трэба кіраваць ці што трэба рухаць (круціць); 7) індывід, які займаецца ці ўдзельнічае ў спартыўных спаборніцтвах ці ў асобным відзе спорту; спартсмен; 8) малады чалавек, хлопец; 9) добры хлопец; той, хто паводзіць сябе ў адпаведнасці з манерамі спартсмена; 10) азартны гулец; 11) яскравая асоба; такая, што апранае крыклівае адзенне, жыве легкадумна [3, с. 20–23].

Між іншым, Генеральная асамблея Міжнароднай рады па фізічным выхаванні і спорце пры ЮНЕСКА 22 кастрычніка 1964 г. прапанавала наступнае азначэнне спорту: дзейнасць, што накіравана на паляпшэнне фізічнай падрыхтоўкі і яе праявы, дзейнасць, якая праводзіцца сістэматычна, у адпаведнасці з правіламі, у якіх ёсць элемент спаборніцтва і імкненне дасягнуць лепшых вынікаў [4]. Пазней у Еўрапейскай хартыі спорту 1992 г. сцвярджаецца наступнае: спорт азначае ўсе формы фізічнай актыўнасці, якія шляхам спецыяльнага або арганізаванага ўдзелу накіраваны на развіццё або паляпшэнне фізічнага і псіхічнага стану, развіццё сацыяльных адносін або дасягненне спартыўных вынікаў на ўсіх узроўнях [4]. Адсутнасць ідэальнага вызначэння спорту падаецца вынікам культурнай эвалюцыі, якая звязваецца з праявамі чалавечай жыццёвай дзейнасці. Можна па-рознаму адносіцца да баёў без правілаў у небяспечных крыміногенных і бедных кварталах шэрага гарадоў свету і ў той жа час назіраць за такімі ж баямі без правілаў у спартыўных залах, дзе прысутнічаюць тысячы гледачоў.

Мэта артыкула заключаецца ў спробе асэнсавання сутнасці паняцця «спорт» на аснове суб'ектыўнай перцэпцыі з пункту гледжання ідэйнай інтэрпрэтацыі гэтага феномену з улікам яго філасофскага і этычнага складнікаў.

Пад увагу бяруцца тыя дынамічныя працэсы, якія адбываюцца ў сучасным свеце, дзе сацыяльная трансфармацыя як грамадская з'ява ўвасабляе ў сабе якасныя змяненні, што ўзнікаюць на пераходзе структурнай арганізацыі ад аднаго ўзроўню да другога. Глыбокі сістэмны крызіс грамадства з'яўляецца найважнейшай падставай гэтага працэсу.

Парадыгма функцыянавання і развіцця спорту ў першай чвэрці XXI ст. ва ўсё большай ступені пачала выяўляць неадпаведнасці адносна папярэдняга ўспрымання сутнасці дадзенага феномена. Філосафы спорту сталі шукаць адказ на пытанне, наколькі дадзеная з'ява адпавядае запытам сучаснага грамадства, ці сапраўды ў сучасных умовах яна ўвасабляе ў сабе імкненне ўдасканалення чалавека ў фізічным, псіхалагічным, маральным, эстэтычным, інтэлектуальным і іншых аспектах як на новым сацыяльна-эканамічным узроўні развіцця грамадства ва ўмовах глабальнага крызісу змяніцца сам фармат яго існавання. Неабходна прыняць да ўвагі, што кубертэнаўскія ідэалы больш не з'яўляюцца прыцягальнымі для прыхільнікаў спорту, які зараз грунтуецца на прыземленым дэвізе «перамога за любы кошт». Прыгожая трыяда аб гарманічна развітой асобе не вытрымлівае брутальнага сутыкнення з рэчаіснасцю. Спорт ва ўмовах камерцыялізацыі імкліва

губляе сваіх прыхільнікаў, што, згодна з тэндэнцыямі глабалізацыі, у лепшым выпадку толькі пакідае яго ў выглядзе прадукта адпаведнага гатунку для патрэбаў спажывецкага грамадства.

***Метады даследавання.*** На падставе філасофскай рэфлексіі аўтар звяртаецца да такіх метадаў даследавання, як назіранне, апісанне, параўнанне, аналіз і інтэрпрэтацыя навуковых, публіцыстычных і дакументальных крыніц, вывучэнне і крытычнае асэнсаванне адкрытай у доступе інтэрнэт-інфармацыі. Экстрапаляцыя выяўленых сацыяльных тэндэнцый у пэўнай меры дае магчымасць прасачыць механізм функцыянавання і развіцця феномена спорту ў іншых сферах чалавечага жыцця.

## Вынікі і абмеркаванне

Спорт перш за ўсё трактуецца як форма спаборніцтва; ён арыентаваны на канкурэнцыю, дзе галоўнай мэтай з'яўляецца перамога або дасягненне найлепшага выніку на адпаведным узроўні згодна з правіламі правядзення спартыўнай дысцыпліны. Прафесіяналізацыя спорту толькі ўзмацніла эфект яго сацыяльнай ролі. Асновай для адрознення спартсмена-прафесіянала ад спартсмена-аматара з'яўляецца вызначэнне таго, ці займаецца атлет спортам па кантракце і атрымлівае за гэта ўзнагароджанне, што з'яўляецца галоўным сродкам падтрымання яго жыццёвай актыўнасці. Суаднясенне паняцця «спорт» з відам эканамічнай дзейнасці дазваляе канстатаваць яе як тую, што прыносіць прыбытак. Такім чынам, варта заўважыць, што гэта могуць быць заняткі спортам, якія адбываюцца ў межах аплатнай працы, аказання паслуг за ўзнагароджанне або вядзенне індывідуальнага прадпрымальніцтва. Урэшце, прафесійны спорт з'яўляецца такім відам сацыяльнай актыўнасці, якая ўтрымлівае ў сабе характарыстыкі эканамічнай дзейнасці. У сувязі з тым, што канкурэнцыя з'яўляецца неад'емным элементам прадпрымальніцтва, нормы канкурэнтнага права будуць распаўсюджвацца і на спартыўную дзейнасць. Аматарскі спорт, які таксама падпадае пад паняцце спаборніцтваў, па сваёй сутнасці мае пэўныя адрозненні ад прафесійнага спорту, бо ім займаюцца асобы, якія маюць іншую сталую працу, што дае ім сродкі для падтрымання сваёй жыццёвай дзейнасці [5].

Адсутнасць дакладнай канкрэтызацыі і пашыранае трактаванне спорту звязана з тым, што ўлічваюцца далёка не ўсе яго сучасныя характарыстыкі, а таксама структурны падзел. Таму аўтар грунтуецца на асабіста выпрацаванай дэфініцыі прафесійнага спорту. Гэта сацыякультурны феномен, дзе на гранічным узроўні рэалізуецца фізічны (у першую чаргу), а таксама псіхалагічны, інтэлектуальны, маральны і іншы патэнцыял як асобнага індывіда, так і групы індывідаў, заснаваны на працяглых і рэгулярных мэтанакіраваных трэніроўках і выяўлены ў форме спаборніцтваў [6, с. 29].

З аднаго боку, паводле ідэалізаванага ўяўлення пра сутнасць спорту ініцыятара адраджэння сучасных Алімпійскіх гульняў П'ера дэ Кубертэна, спорт застаецца тым, чым быў у часы Старажытнай Грэцыі, а менавіта спаборніцтвам паміж індывідамі, якія дэманструюць паводле адпаведна вызначаных правілаў сваю фізічную і духоўную дасканаласць. З другога боку, відавочна, што сучасны фармат спорту не адпавядае мінулым стэрэатыпам і існуе ў зусім іншым выглядзе, і спосабы яго цяперашняй арганізацыі і функцыянавання не падпадаюць у большасці выпадкаў пад логіку спартыўнага спаборніцтва. Гэта залежыць ад камерцыялізаванага падыходу, што найперш патрабуе адпаведных інвестыцый, а далей – атрымання прыбыткаў у сферы, якая разглядае спорт у якасці галіны эканамічнай дзейнасці. Дастаткова параўнаць «класічны футбол» пачатку XX ст. і сучасны, «індустрыяльны футбол» XXI ст., які характарызуецца як звычайны бізнес, а функцыянаванне футбольнага клуба па ўсіх параметрах павінна адпавядаць патрабаванням рынкавай гаспадаркі. Павелічэнне зацікаўленасці да мадэлі сучаснага спорту з боку шырокіх слаёў насельніцтва выклікана ўвагай да прыватнага жыцця знакамітых атлетаў, да велічыні трансферных пагадненняў, да інструментальнага выкарыстання зорак спорту ў рэкламе тых ці іншых тавараў або ідэалогіі. Зрэшты, выглядае даволі дзіўным, што ў вывучэнні праблем функцыянавання і развіцця грамадства для спорту застаецца так мала месца. Сучасны спорт у прынцыпе з'яўляецца адлюстраваннем усіх тых праблем і з'яў, якія цікавяць даследчыкаў. Гэта, напрыклад, медыярынак і яго роля ў свеце спорту, асабістыя характарыстыкі знакамі-

тых і выдатных прадстаўнікоў спорту, фінансавыя паказчыкі эфектыўнай дзейнасці ў галіне спорту, праявы нацыянальнай самасвядомасці і нацыяналізму, афектыўная эканоміка, праблемы сексізму, гендару і жанчынаненавісніцтва, уплыў спорту на спажывецкае грамадства і поп-культуру, працэсы глабалізацыі, лібералізацыі, гуманізацыі, фемінізацыі, міграцыі і іншыя глабальныя інстытуты, джэнтрыфікацыя бедных і крыміналізаваных раёнаў, карупцыя, адарванасць палітычных эліт ад спадзяванняў і інтарэсаў ніжэйшых класаў, неалібералізацыя сацыяльных адносін, бенчмаркінг, тэхналагічнае ўмяшальніцтва ў чалавечае цела, жорсткасць у адносінах да жывёл, стандартызацыя і гамагенізацыя ў культуры, праблемы ў экалогіі і т. зв. грынвошынг, сацыяльна-палітычная актыўнасць і антыкапіталістычныя рухі, расізм, лёс і становішча т. зв. карэнных народаў, адносіны паміж цэнтрам і перыферыяй і г. д. згодна з асновамі крытычнай тэорыі. Апошняя заснавана на шэрагу падыходаў, плыняў і дыскурсаў, што крытычна разглядаюць грамадства і культуру з мэтай эмансіпацыі на падставе ведаў з сацыяльных і гуманітарных навук з улікам узрастання трансдысцыплінарнасці і рэфлексійнай палітызацыі як феноменаў сучасных дасягненняў. Напрыклад, Ян Сова і Кшыштаф Валяньскі, якія дэталёва аналізуюць сучасны спорт, падкрэсліваюць яго непарыўную сувязь у функцыянаванні і развіцці з галоўнымі тэндэнцыямі капіталістычнай канкурэнтаздольнасці, падаюць галоўны матыў яго дзейнасці – To compete, to win, to profit… [7].

Сродкі масавай інфармацыі ствараюць максімальна магчымы культ зорак спорту, прычым шырокія колы грамадскасці інфармуюцца не толькі пра вынікі спартыўных спаборніцтваў, але і пра прыватнае жыццё атлетаў. Падаюцца таксама лічбы кантрактаў, трансферныя акалічнасці, асаблівасці адносін паміж ігракамі ў камандзе, велічыні штрафных санкцый і г. д. Такое становішча не можа выклікаць здзіўлення, бо для сотняў мільёнаў балельшчыкаў спартыўныя селебрыці з’яўляюцца не толькі прыкладам паспяховага асабістага жыцця – яны проста становяцца іх кумірамі, героямі масавых наратываў, якія адлюстроўваюць памкненні ў масавым іх увасабленні. У цэлым патрабуецца таксама высветліць пытанне аб перспектывах утварэння і захавання ў дадзенай сістэме ідэалогіі і практыкі сучаснага спорту. Іншымі словамі, спорт запраграмаваны на тое, каб суб’екты яго дзейнасці імкнуліся дасягнуць сувымяральных вынікаў (галы, перамогі, набраныя пункты, рэкорды), на чым, уласна, і палягае логіка функцыянавання вольнага рынку, што падтрымліваецца ўласнымі інтарэсамі актуальных палітычных колаў. Такое становішча мае здольнасць да існавання ў бліжэйшай ці больш аддаленай перспектыве і базіруецца на асацыяцыях яго іміджавага вобразу разам са створаным дыскурсам, які грунтуецца на ідэалах алімпізму, прынцыпах Fair play, пераканання ў існаванні гуманістычнага вымярэння спартыўнай адукацыі, дамінантным патрабаванні супрацоўніцтва паміж народамі і інш. [8, с. 206–207].

Аднак сацыяльная рэальнасць ва ўсё большай ступені дэманструе тэндэнцыі змястоўных змяненняў унутранай сутнасці спорту. Чарговым крокам, які сведчыць пра яго дэградацыю, з’яўляецца неадназначна інтэрпрэтаваная сітуацыя падчас чэмпіянату свету па лёгкай атлетыцы ў Будапешце 2023 г. у фінале скачкоў з шастом сярод жанчын. Ці здарылася там нешта неардынарнае? Прадстаўніца ЗША Кэці Мун змагалася за золата з аўстралійкай Нінай Кенэдзі. Пасля таго, як саперніцы не змаглі пераадолець вышыню 4,95 м, а да таго мелі абсалютна роўныя папярэднія паказчыкі, яны згодна з правіламі павінны былі б працягваць спаборніцтвы далей на ніжэйшых адзнаках вышыні да таго моманту, пакуль нехта з іх не выявіцца пераможцай. Або ў другім варыянце перапынялі спаборніцтва і падзялялі першае месца, што і было зроблена пасля кароткай размовы паміж сабой: яны адмовіліся ад далейшага змагання і звярнуліся да арганізатараў першынства з прапановай аб узнагароджанні кожнай з іх залатым медалём. Іншымі словамі, яны самастойна вырашылі падзяліць залаты медаль, каб такім чынам разам апынуцца на вышэйшай прыступцы пастамента гонару. Пазней Ніна Кенэдзі сказала, што ў такім учынку няма нічога дзіўнага, бо іх даўно звязваюць сяброўскія адносіны, хоць напачатку яна сама не да канца была ўпэўнена ў тым, ці пагодзіцца яе саперніца на гэтую прапанову. Аднак не ўсе прыхільнікі спорту

былі ў захапленні ад іх паводзін. У сродках масавай інфармацыі ўзнялася хваля неадназначных эмацыянальных водгукаў. Не было адзінай узгодненай думкі адносна гэтага ўчынку як сярод спецыялістаў, так і сярод прыхільнікаў спорту [9].

Напрыклад, чатырохразовы алімпійскі чэмпіён і васьміразовы чэмпіён свету ў бегу на 200 м і 400 м амерыканец Майкл Джонсан лічыць, што падобныя паводзіны могуць негатыўна паўплываць на саму канкурэнцыю ў будучыні. Ён задаецца пытаннем: «Вам падабаецца, калі дзеляць золата? Калі вы адкажаце так, маё другое пытанне: ці хацелі б вы, каб гэта аднойчы стала больш распаўсюджаным?» [9]. Справа ў тым, што спартыўная дзейнасць у якасці аднаго з галоўных складнікаў утрымлівае ў сабе элемент канкурэнтнасці, каб выявіць найлепшы вынік, выявіць урэшце пераможцу. У дадзеным выпадку мы маем справу з ігнараваннем сутнасці спартыўнай дзейнасці, размеркаваннем месцаў у турнірнай табліцы па дамоўленасці, а таксама ўплывам на велічыню грашовага ганарару за перамогу. Як падае кіраўніцтва Міжнароднай асацыяцыі легкаатлетычных федэрацый World Athletics, да залатога медалю ў Будапешце дадавалася $70 000, да сярэбранага – $35 000, да бронзавага – $22 000 [10]. Паводзіны амерыканкі і аўстралійкі сустрэлі даволі неадназначна карыстальнікі Інтэрнэту. Яны звярнулі ўвагу на неадпаведнасці рэгламенту змаганняў, на магчымасць заключэння дамоўленасцяў паміж спартоўцамі перад спаборніцтвамі, на стварэнне абсурдных сітуацый з прысуджэннем большай колькасці медалёў замест трох традыцыйных, на ігнараванне выяўлення сапраўднага пераможцы, на магчымасць прымаць падобнае рашэнне самімі спартсменамі падчас выступленняў і інш. [9]. Належыць дадаць, што некалькі раней падобная гісторыя здарылася падчас летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа ў 2020 г. Катарац Мутаз Баршым і італьянец Джанмарка Тамберы падзялілі першае месца ў скачках у вышыню і таксама не пажадалі змагацца далей. Цікава заўважыць, што тады шмат якія эксперты і балельшчыкі былі ў захапленні ад учынку атлетаў. Але вось прайшло зусім няшмат часу, як адносіны да падобнай сітуацыі сталі мяняцца [11].

Яшчэ адным яскравым парушэннем сутнасці спартыўнага спаборніцтва з'яўляецца адна з гульняў фінальнай стадыі чэмпіянату свету па футболе 1982 г. паміж зборнымі камандамі Аўстрыі і Федэратыўнай Рэспублікі Германіі. Перад вырашальным матчам за выхад з групы тры сапернікі прэтэндавалі на два месцы: гэта ўжо названыя вышэй калектывы, а таксама зборная Алжыра. Гульня Аўстрыя – ФРГ скандальна вядомая таму, што ўласна сам футбол там працягваўся адзінаццаць хвілін да таго моманту, пакуль немцы не забілі адзіны гол у сустрэчы. Менавіта такі лік задавальняў як адзін, так і другі бок, і гэта дазваляла ім праходзіць у наступную стадыю турніру. Тое, што пачалося далей, інакш як абразай футбола назваць было нельга. У выніку абедзве дружыны наступныя восемдзесят хвілін рабілі выгляд, што працягваюць гульню. Мяч пераважна знаходзіўся ў цэнтры поля, пастаянна вяртаўся да тылу, каманды толькі дэманстравалі сваю прысутнасць праз далёкія перадачы без усялякай спробы атакаваць. Сорак тысяч гледачоў на стадыёне выказвалі сваю абуранасць тым, як праходзіць сустрэча. Нямецкі каментатар нават перастаў весці рэпартаж. Зразумела, што як аўстрыйцы, так і немцы адмаўлялі факт дамоўленасці адносна выніку матча. Тым не менш Міжнародная федэрацыя футбола адрэагавала на гэты інцыдэнт: з таго часу гульні апошняга тура ў групах сталі праводзіцца паралельна ў адзін дзень і адзін час [12].

Камерцыялізацыя сучаснага спорту ва ўмовах глабалізаванага грамадства знайшла сваё яскравае ўвасабленне ў формуле «To compete, to win, to profit». Але зусім хутка філосафы спорту пачнуць аналізаваць новыя тэндэнцыі ў гэтай галіне, якія сведчаць пра наступны этап заняпаду. Спорт застанецца як сацыякультурны феномен, аднак гэта з'ява набудзе новы змест, новае ўвасабленне. Сутнасць спорту зменіцца, і гэтыя змены можна прасачыць ужо зараз. Аўтар на працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў у шэрагу артыкулаў выказваў думку адносна далейшага развіцця спорту і адзначаў яго падзел у двух наступных накірунках. Першы, які базіруецца на аснове яго класічнага ўспрымання і грунтуецца на прынцыпах сумленнай высакароднай гульні, можа быць абазначаны як Fair play games. На гэтым узроўні маральны крытэрый

з’яўляецца дамінантным і не пад-лягае ніякаму аспрэчванню. Адпаведна, другі накірунак пад назвай Open games характарызуецца як спаборніцтвы, дзе ігнаруюцца асноўныя іх правілы, адсутнічае праверка на допінг, дапускаюцца змешаныя змаганні без уліку ўзросту, гендарных асаблівасцяў, вагавых катэгорый і г. д. І вось апошнім часам усё больш дыскусій, пакуль на ўзроўні публіцыстычнай палемікі, набывае тэматыка адносна Enhanced Games. Ініцыятарамі ідэі новых гульняў з’яўляюцца венчурныя капіталісты і прыхільнікі крыптавалют Пітэр Цыль, Хрысціян Ангермаер і Баладжы Шрынівасан, якія прафінансавалі гэты праект. Праўда, пакуль невядома, хто будзе прымаць удзел у спаборніцтвах, калі і дзе яны стартуюць і якая велічыня прызавых плануецца для пераможцаў.

Трэба падкрэсліць, што Пітэр Цыль з’яўляецца адным з сузаснавальнікаў буйнейшай дэбетавай электроннай плацёжнай сістэмы PayPal і амерыканскай кампаніі па распрацоўцы праграмнага забеспячэння аналізу дадзеных для арганізацый Palantir Technologies і быў першым знешнім інвестарам у Facebook. Не менш вядомая прыватная інвестыцыйная кампанія Apeiron Investment Group Хрысціяна Ангермаера, якая распрацоўвае праграмы тэхналогіі будучыні, што, на яго думку, дазволіць людзям быць здаровымі і шчаслівымі, а таксама жыць даўжэй. Трэцяя вядомая асоба Баладжы Шрынівасан – былы тэхнічны дырэктар буйнейшай крыптавалютнай біржы амерыканскай кампаніі Coinbase Global, Inc.

Калі паспрабаваць больш дэталёва прааналізаваць Enhanced Games, то адным з галоўных адрозненняў гэтага новага спаборніцтва з’яўляецца тое, што спартсменам-удзельнікам будзе дазволена ўжываць допінг, біялагічныя і харчовыя дабаўкі ў такой ступені, у якой яны самі гэтага пажадаюць. Іншымі словамі, ніякіх допінг-тэстаў праводзіць не плануецца. Згодна з думкай ідэолага гульняў новага тыпу Арона Д’Соузы, які, дарэчы, з’яўляецца рэдактарам квартальніка па філасофіі права «The Journal Jurisprudence», падобнага роду імпрэза павінна пабіць усе сусветныя рэкорды і больш поўна раскрыць чалавечы патэнцыял [13].

Арганізатары новых гульняў вызначылі пяць асноўных відаў спорту, сярод якіх назвалі плаванне, гімнастыку, адзінаборствы, лёгкую і цяжкую атлетыку. Медалямі і грашовымі прызамі плануецца ўзнагароджваць лепшых удзельнікаў у кожным відзе спаборніцтваў. Дадаткова ганарары атрымаюць тыя, хто ўстановіць новыя сусветныя рэкорды, якія тым самым прадэманструюць пашырэнне межаў таго, што лічыцца магчымым. У якасці дэвіза новых гульняў прапанавана ўзяць вядомы выраз «Citius. Altius. Fortius» («Хутчэй. Вышэй. Мацней») з пашырана трактаваным зместам, дзе найважнейшым паказчыкам у сістэме спаборніцтваў выступае перамога на падставе максімальна магчымага выніку, прычым арганізатары не плануюць праверку ўдзельнікаў на спажыванне допінгавых сродкаў, сістэма тэставання будзе адсутнічаць, дэкларацыя аб стымулятарах перад выступленнямі не патрабуецца. Новыя гульні маюць адбыцца дзякуючы прыватнаму фінансаванню, без датацый з бюджэту, але тым не менш яны плануюцца як прыбытковае мерапрыемства і пры гэтым вабяць атлетаў высокімі ганарарамі, велічыня якіх да пары не падаецца. Па словах Арона Д’Соузы, у яго ўжо адбыліся размовы са спартсменамі, якія лічацца найлепшымі спрынтарамі свету, якія, калі пачулі, што за сусветны рэкорд у бегу на 100 м будзе прыз у мільён долараў, паабяцалі свой удзел у спаборніцтвах, нягледзячы на выступленне на Алімпійскіх гульнях.

Ідэалагічнае забеспячэнне Enhanced Games падаецца як абнаўленне алімпійскай мадэлі ў XXI ст. з улікам таго, што ў эпоху паскоранага тэхналагічнага развіцця кубертэнаўскі падыход састарэў, грамадству патрэбны новыя героі, якія і будуць на вяршыні спартыўнай падзеі будучыні, і дзеля гэтага неабходна скарыстацца дасягненнямі сучаснай медыцыны. У гэтай дэкларацыі няма нічога дзіўнага, асабліва калі нагадаць, што, напрыклад, Хрысціян Ангермаер актыўна займаецца распрацоўкамі ў галіне біятэхналогій, даўгалецця і псіхічнага здароўя. Зразумела, што спаборніцтвы ў такім разе могуць разглядацца як выдатная пляцоўка для разнастайных эксперыментаў з чалавечым целам і духам, а дадаткова яшчэ і як рэкламны праект.

Арганізатары Enhanced Games пазіцыянуюць сябе як стваральнікі альтэрнатывы карупцыйнай алімпіядзе, якую праводзіць МАК, прычым падкрэсліваюць, што з

тых мільярдаў долараў прыбытку з гульняў спартоўцы атрымліваюць замалыя ганарары. Каб падняць спаборніцтвы на якасна новы ўзровень, прапануецца на падставе навукі прыняць сістэму капіталістычнага ладу, усталяваць шматразовае выкарыстанне пабудаванай інфраструктуры, прапанаваць справядлівую аплату за змаганні для спартоўцаў, вызначыць галоўныя віды спорту, пераўзысці сусветныя рэкорды і падтрымаць магчымыя ўдасканаленні ў сферы спорту [14].

**Заключэнне**

Заняпад спорту ў класічным яго разуменні пачынаецца з пранікнення ў яго функцыянаванне тэндэнцый камерцыялізацыі з мэтай атрымання прыбыткаў. Найбольш прывабныя ў гэтых адносінах спартыўныя дысцыпліны ператварыліся ў паспяховы бізнес, яны існуюць у сістэме рынкавай канкурэнтнасці, згодна з тымі патрабаваннямі, якія вызначаны на аснове мэтазгоднасці эканамічнай дзейнасці. Інвестыцыі ў спорт з боку Enhanced Games відавочна з'яўляюцца спробай перадзелу фінансавых патокаў у гэтай галіне, асабліва калі ўлічыць, што Пітэр Цыль укладвае мільёны долараў у падтрымку даследаванняў, накіраваных на распрацоўку разнастайных біялагічных і харчовых дадаткаў для павышэння прадукцыйнасці працы і зніжэння тэмпаў працэсу старэння, а Хрысціян Ангермаер стварае праграмы тэхналогіі будучыні, што ў перспектыве дазволіць людзям быць здаровымі і шчаслівымі, а таксама жыць даўжэй [15].

Ідэя новых гульняў, на думку іх ініцыятараў, дае самім атлетам магчымасць для выбару адносна таго, ужываць допінг або не, і не залежыць у гэтым пытанні ад спартыўных федэрацый і пазіцый краін, якую яны маюць права прадстаўляць. Такое стаўленне падаецца па меншай меры сумніўным нават тады, калі ў якасці доказу прыводзіцца аргумент, што цела спартсмена належыць яму самому і нікому іншаму. Але адна справа, калі такое параўнанне датычыцца тату на целе атлета, і зусім іншая, калі грамадства сутыкаецца з праблемай алкагалізму, ужывання наркотыкаў і псіхатропаў. Экстрапаляцыя такога падыходу на іншыя сферы чалавечай жыццёвай актыўнасці немінуча стварае ўмовы для спажывання біялагічных і харчовых дабавак, допінгавых рэчываў у іншых сферах прафесійнай дзейнасці. Ці магчыма сабе ўявіць супрацоўніка, які знаходзіцца падчас выканання сваіх непасрэдных абавязкаў пад уплывам наркатычных рэчываў для паляпшэння вынікаў сваёй працы? Ідэалагічныя падставы новых гульняў адназначна руйнуюць традыцыйнае ўяўленне аб спорце, не толькі ствараюць пагрозу для ўласнага здароўя спартоўцаў, але і становяцца патэнцыяльна небяспечнымі для грамадства ў цэлым. Варта дадаць, што кіраўніцтва Міжнароднага алімпійскага камітэта рэзка адмежавалася ад агучанай прадстаўнікамі Enhanced Games ініцыятывы і нават адмовілася ад якіх-небудзь каментарыяў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка і М. Н. Крыўко. – Мінск : БелЭн, 1996. – 784 с.

2. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў : у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 2 : М – Я. – 736 с.

3. The World Book Dictionary. Volume two. L – Z. – Chicago ; London ; Sydney ; Toronto : World Book, Inc., 1993. – P. 1167–2430.

4. Definicja sportu [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://krasnikfabryczny.home.blog/-definicja-sportu/. – Data dostępu: 02.03.2024.

5. Pojęcie sportu wyczynowego w prawie Unii Europejskiej [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu https://prawosportowe.pl/a/pojecie-sportu-wyczynowego-w-prawie-unii-europejskiej. – Data dostępu: 02.03.2024.

6. Люкевіч, У. П. Метадалагічныя і сацыяльна-філасофскія праблемы спорту : манаграфія / У. П. Люкевіч. – Брэст : Выд-ва Брэсц. дзярж. ун-та, 2000. – 246 с.

7. Sowa, J. Sport nie istnieje. Igrzyska w społeczeństwie spektaklu / J. Sowa, K. Wolański. – Warszawa, 2020. – 304 s.

8. Nakonieczny, T. Współczesna «kulturalizacja» sportu jako forma kompensacji dyskursywna i pozadyskursywna heterogeniczność sportu / T. Nakonieczny // Przegląd Zachodni. – 2018. – Nr 4. – S. 203–218.

9. Kuriozalna sytuacja po złocie tyczkarek na MŚ. W sieci aż zawrzało [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://sport.interia.pl/lekkoatletyka/ms-2023/news-kuriozalna-sytuacja-po-zlocie-tyczkarek-na-ms-w-sieci-az-zaw,nId,6990347. – Data dostępu: 29.08.2023.

10. TDK and World Athletics to support world record programme in Budapest [Electronic resource]. – Mode of access: https://worldathletics.org/competitions/world-athletics-championships/world-athletics-championships-budapest-2023-7138987/news/press-releases/tdk-world-athletics-world-record-programme-budapest-23. – Date of access: 06.03.2024.

11. Odmówiły dalszej rywalizacji. Dostały po złotym medalu [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://sportowefakty.wp.pl/la/1077721/nie-chcialy-juz-skakac-dalej-wzruszajace-sceny-na-ms-wideo. – Data dostępu: 06.03.2024.

12. Najbardziej haniebny mecz w historii piłki nożnej. Komentator milczał przez 30 minut [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://www.sport.pl/pilka/7,64946,26066013,najbardziej-haniebny-mecz-w-historii-pilki-noznej-komentator.html. – Data dostępu: 01.03.2024.

13. Enhanced Games: The alternative Olympics where athletes won't be drug tested [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.itv.com/news/2023-06-30/the-enhanced-games-the-olympics-with-no-drugs-testing. – Date of access: 06.03.2024.

14. Olympics with no drug testing? Australian man plans Enhanced Games with doping allowed [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.usatoday.com/story/sports/olympics/2023/-06/26/enhanced-games-olympic-doping-allowed/70357545007/. – Date of access: 06.03.2024.

15. Billionaire Peter Thiel bankrolling 'Olympics on steroids' event that allows athletes to dope [Electronic resource]. – Mode of access: https://nypost.com/2024/02/01/business/peter-thiel-is-bankrolling-enhanced-games-olympics-on-steroids/. – Date of access: 06.03.2024.

## REFERENCES

1. Tlumachal'ny slounik bielaruskaj litaraturnaj movy / pad red. M. R. Sudnika i M. N. Kryuko. – Minsk : BielEn, 1996. – 784 s.

2. Bulyka, A. M. Slounik inshamounykh slou : u 2 t. / A. M. Bulyka. – Minsk : BielEn, 1999. – T. 2 : M – Ja. – 736 s.

3. The World Book Dictionary. Volume two. L – Z. – Chicago ; London ; Sydney ; Toronto : World Book, Inc., 1993. – P. 1167–2430.

4. Definicja sportu [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://krasnikfabryczny.home.blog/-definicja-sportu/. – Data dostępu: 02.03.2024.

5. Pojęcie sportu wyczynowego w prawie Unii Europejskiej [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu https://prawosportowe.pl/a/pojecie-sportu-wyczynowego-w-prawie-unii-europejskiej. – Data dostępu: 02.03.2024.

6. Liukievich, U. P. Mietadalahichnyja i sacyjal'na-filasofskija prabliemy sportu : manahrafija / U. P. Liukievich. – Brest : Vyd-va Bresc. dziarzh. un-ta, 2000. – 246 s.

7. Sowa, J. Sport nie istnieje. Igrzyska w społeczeństwie spektaklu / J. Sowa, K. Wolański. – Warszawa, 2020. – 304 s.

8. Nakonieczny, T. Współczesna «kulturalizacja» sportu jako forma kompensacji dyskursywna i pozadyskursywna heterogeniczność sportu / T. Nakonieczny // Przegląd Zachodni. – 2018. – Nr 4. – S. 203–218.

9. Kuriozalna sytuacja po złocie tyczkarek na MŚ. W sieci aż zawrzało [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://sport.interia.pl/lekkoatletyka/ms-2023/news-kuriozalna-sytuacja-po-zlocie-tyczkarek-na-ms-w-sieci-az-zaw,nId,6990347. – Data dostępu: 29.08.2023.

10. TDK and World Athletics to support world record programme in Budapest [Electronic resource]. – Mode of access: https://worldathletics.org/competitions/world-athletics-championships/world-athletics-championships-budapest-2023-7138987/news/press-releases/tdk-world-athletics-world-record-programme-budapest-23. – Date of access: 06.03.2024.

11. Odmówiły dalszej rywalizacji. Dostały po złotym medalu [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://sportowefakty.wp.pl/la/1077721/nie-chcialy-juz-skakac-dalej-wzruszajace-sceny-na-ms-wideo. – Data dostępu: 06.03.2024.

12. Najbardziej haniebny mecz w historii piłki nożnej. Komentator milczał przez 30 minut [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://www.sport.pl/pilka/7,64946,26066013,najbardziej-haniebny-mecz-w-historii-pilki-noznej-komentator.html. – Data dostępu: 01.03.2024.

13. Enhanced Games: The alternative Olympics where athletes won't be drug tested [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.itv.com/news/2023-06-30/the-enhanced-games-the-olympics-with-no-drugs-testing. – Date of access: 06.03.2024.

14. Olympics with no drug testing? Australian man plans Enhanced Games with doping allowed [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.usatoday.com/story/sports/olympics/2023/-06/26/enhanced-games-olympic-doping-allowed/70357545007/. – Date of access: 06.03.2024.

15. Billionaire Peter Thiel bankrolling 'Olympics on steroids' event that allows athletes to dope [Electronic resource]. – Mode of access: https://nypost.com/2024/02/01/business/peter-thiel-is-bankrolling-enhanced-games-olympics-on-steroids/. – Date of access: 06.03.2024.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 14.04.2024*